Рабочы ліст да апавядання В.Быкава “Незагойная рана”

І ёй успамінаецца тады,
Як сын казаў: «Вярнуся, не загіну,
Чакай мяне... Чакай!..»
Ідуць гады,
І кожны дзень чакае маці сына.

1.Вызнач адпаведныя суадносіны “партрэт-пісьменнік”






У.Караткевіч Якуб Колас Максім Танк Васіль Быкаў

*2.Штуршком для таго, каб Тэкля пайшла насустрач сыну, з’явіўся:*

а) прыход па запалкі суседскай дзяўчынкі Ульянкі;

б) сон напярэдадні дня нараджэння Васілька;

в) няласкавы адказ ёй пісьманосца пры чарговай сустрэчы;

г) пакутлівыя ўспаміны пра мінулае;

д) думкі, што сын сышоў на бліжэйшай станцыі і яму неабходна дапамагчы паднесці рэчы.

*3. Ля абеліска воінам Тэклю асабліва кранула (крануў):*

а) гутарка з жанчынай-удавой, у якой муж загінуў на фронце; б) сустрэча з былымі ўдзельнікамі Вялікай Айчыннай вайны;

в) жывыя чырвоныя ружы;

г) надпіс са словамі: “Лейтэнант Авяр’янаў, гвардыі старшына Кузняцоў, радавыя Бондараў, Піліпенка, Чарных і іншыя”;

д) дагледжаны, падпраўлены і нядаўна пабелены помнік.

*4. Ля каменнага абеліска з зоркай наверсе Тэкля:*

LIVEWORKSHEETS

а) на ўмураванай дошчачцы, дзе былі пазначаны тыя, хто тут пахаваны, прозвішча сына не знайшла;

б) прачытала, што тут знайшоў апошні свой прытулак яе Васілька;

в) надумала далей шукаць сына, пабываць ля іншых абеліскаў;

г) канчаткова страціла веру, надзею ўбачыць жывым сына;

д) вырашае больш свайго Васілька не шукаць.

*5. Каб расказаць пра жыццё Тэклі сцісла, за кароткі прамежак часу, аўтар выкарыстоўвае:*

а) аповеды-ўспаміны аднапалчан сына;

б) яе ўласныя ўспаміны;

в) аповед пра паездку да помніка ў суседнюю вёску;

г) сны жанчыны;

д) эпізадычныя сустрэчы Тэклі з іншымі персанажамі твора.

*6..Драматызм становішча Тэклі перадаецца ў апавяданні праз:*

а) яе ўспаміны;

б) пейзаж;

в) бытавыя дэталі;

г) сны старой жанчыны;

д) размовы з іншымі дзейнымі персанажамі.

7.*Эпітэт – гэта:*

а) мастацкі прыём, разнавіднасць метафары, прыпадабненне з'яў прыроды да паводзін чалавека;

б) двухскладовая стапа з націскам на другім складзе;

в) мастацкае азначэнне, якое адыгрывае важную ролю ў характарыстыцы жыццёвых з'яў, чалавека;

г) урачыста-жалобны літаратурны твор;

LIVEWORKSHEETS

д) падрабязнасць у апісанні пэўных аб’ектаў у творы, якая з асаблівай сілай абуджае ўяўленні і творчую думку чытача і нясе значную эмацыянальную і сэнсавую нагрузку.

*8..Пейзаж у мастацкім творы:*

а) карціна прыроды, якая абавязкова з’яўляецца галоўным дзейным персанажам;

б) арганічна ўваходзіць у вобразную сістэму твора;

в) з’яўляецца важным сродкам мастацкай выразнасці;

г) выконвае ролю апісання месца дзеяння, абстаноўкі, у якой адбываюцца падзеі;

д) можа выяўляць думкі, пачуцці, настроі, перажыванні аўтара ці героя.

*9.Якім вобразна-выяўленчым сродкам (мастацкім тропам) з’яўляюцца падкрэсленыя словы?*

Буяе над абшарамі сцюдзёны асенні вецер, змятае пад прызбы пажоўклае лісце, гайдае мокрае галлё ў садку. Гарэзным свавольнікам выскаквае ён з-за вуглоў на цесны панадворак, цярэбіць саламяную страху хлеўчука, нібы дурэючы, тузае па Тэклінай спіне блытаныя махры яе хусткі:

а) параўнаннем;

б) эпітэтам;

в) метафарай;

г) метаніміяй;

д) гіпербалай.

*10.Памяняйце пункты кампазіцыі (сюжэта) так, каб яны адпавядалі паслядоўнасці падзей, апісаных у апавяданні (упішыце ў дужкі свой варыянт нумароў):*

( ) а). – Што ж гэта вы лямпы не паліце? А я прыйшла па запалкі, калі багаты.

( ) б). На адным баку абеліска чарнела ўмураваная ў яго дошчачка з не дужа зграбна напісанымі, але выразнымі літарамі – спісам пахаваных байцоў.

LIVEWORKSHEETS

( ) в). – Ну што ты мяне пільнуеш усё? Няма ж табе нічога. Нічога няма! – крычыць ён у твар жанчыне і знікае за рогам.

( ) г). Тэкля ўзнімае голаў, слухае і сапраўды чуе няпэўныя крокі на ганку і ціхі кароткі стук. Ён! Старая ўзнімаецца на печы, спускаецца і, сцягнуўшы за сабою ватоўку, таропка бразгоча зашчапкай...

( ) д). Ён нарадзіўся ў гэткі ж, як сёння, ветраны восеньскі дзень... Бацька толькі што перахварэў на тыф, ужо ўзняўся, хадзіў, але быў яшчэ кволы і слабы.

*11.Якім элементам сюжэта (кампазіцыі) з'яўляюцца ўспаміны Тэклі пра дзяцінства і юнацтва сына Васілька?*

а) экспазіцыяй;

б) завязкай дзеяння;

в) развіццём дзеяння;

г) кульмінацыяй;

д) заканчэннем дзеяння.

*12.Асаблівасцямі апавядання з'яўляюцца:*

а) дзеянне адбываецца ў дзвюх часавых плынях: цяперашнім і мінулым; б) псіхалагічныя матывацыі ўчынкаў персанажаў;

в) малая колькасць дзейных асоб; пейзаж, успаміны дапамагаюць раскрыць характар Тэклі;

г) павольнае разгортванне сюжэта; апісанні прыроды невялікія, сціслыя;

д) чаргаванне падрабязнасцей жыцця, пейзажу, побыту з душэўнымі перажываннямі герояў.

LIVEWORKSHEETS

13. Знайдзіце бытавыя дэталі, якія характарызуюць стан гаспадаркі Тэклі.




LIVEWORKSHEETS